# ЕЎРАБЮЛЕТЭНЬ

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ВЫДАННЕ ПРАДСТАЎНІЦТВА ЕЎРАПЕЙСКАГА САЮЗА Ў БЕЛАРУСІ

САКАВІК 2013



# 3D: ДЕТИ ДЕЛАЮТ ДОБРО
## благотворителем может быть каждый

This project is funded by the European Union

«Увага, усмешку!»
2,5 гады творчага пошуку

Эфектыўна працаваць, эканомна жыць:
фінансаванне энергаэфектыўных праектаў

## ЗМЕСТ / CONTENTS


### КАДРЫ МЕСЯЦА / PICTURES OF THE MONTH

3 **«Пагадненне дасягнута» / AGREEMENT REACHED**
During a summit in Brussels on 8 February, European Union leaders reached an agreement on the first ever cut to the EU's long-term budget.

### ПАДЗЕЯ МЕСЯЦА /TOP STORY

4 **9 высноваў з Усходняга партнёрства / THE EASTERN PARTNERSHIP — NINE CONCLUSIONS**
On 18 February the Foreign Affairs Council took stock of the Eastern Partnership's latest developments.

### ЦЫТАТЫ / QUOTATIONS

5 **Што гаварылі галоўныя еўрапейскія чыноўнікі / POINTS MADE: QUOTATIONS FROM TOP EUROPEAN UNION OFFICIALS**
Andrea VASSILIOU, the European Commissioner for Education, Culture, Multilingualism and Youth, on the launch of U-Multirank, a new university ranking system. Vice-President of the European Commission Viviane Reding on new measures to protect the euro against counterfeiting.

### ЛІЧБЫ / BY THE NUMBERS

6 **€105 million for the Pompeii rescue project; 335 works in 37 European countries were nominated for the 2013 European Union Prize for Contemporary Architecture — Mies van der Rohe Award; €680 million awarded to 302 senior research leaders in 24 different countries across Europe in the European Research Council's Advanced Grant competition; 1,197,618 signatures collected by the European Citizens' Initiative for the Human Right to Water.**

### ГАЛОПАМ ПА ЕЎРОПАХ / ACROSS EUROPE

8 **Европейский Союз едет к вам / LET'S MEET EUROPE ON WHEELS**
A report on a mobile information campaign launched by the Delegation of the European Union to Georgia as part of an EU-funded project called Let's Meet Europe.

10 **Разам супраць катастроф / TOGETHER AGAINST DISASTERS**
A report on PPRD East, an EU-funded programme designed to help prevent, prepare for and respond to man-made and natural disasters in Eastern Neighbourhood countries.

### НАПРАМАК РУХУ / ON THE MOVE

12 **Эфектыўна працаваць, эканомна жыць / FOSTERING A HOME-GROWN ENERGY EFFICIENCY INDUSTRY**
A new EBRD programme in Belarus will provide local banks with up to USD 50 million to finance investments in energy efficiency and renewable energy through medium-sized industrial firms and small businesses.

### ДОСВЕД / WORKING TOGETHER

14 **Всемирная сеть на службе у малого бизнеса / THE WORLD WIDE WEB AT THE SERVICE OF SMALL BUSINESS**
The EU-supported EgoPrise project is helping to create a system in which enterprises have access to all necessary information in electronic format and avoid administrative barriers.

16 **«Увага, усмешку!» / SAY CHEESE!**
How to create more favourable conditions for the development of photographic art and strengthen collaboration between photographers from Belarus, Armenia, Georgia, Azerbaijan, Ukraine and Moldova? A Belarusian foundation for international dialogue and cooperation «Interakcia», a participant of the Eastern Partnership project SAY CHEESE!, knows how.

### СЛОЎНІК / DICTIONARY

18 **Еўражаргон: зразумей суседзяў / EUROJARGON: UNDERSTAND YOUR NEIGHBOURS**
People working for European institutions or EU publications sometimes use «Eurojargon»: words and expressions some of us have difficulty understanding. The Eurobulletin takes a look at some of them.

### ДАСЯГНЕННІ / MILESTONES

19 **«3D: Дети Делают Добро!» / CHILDREN PHILANTHROPISTS**
At first glance, «3D: children doing good!» is an ordinary charity event. But the philanthropists in this unique initiative are not adults but children who themselves are orphans or children without parental care.

### ПАРТРЭТ МЕСЯЦА / PORTRAIT OF THE MONTH

20 **Катерина Коврова / KATERINA KOVROVA**
Project coordinator of the Healthy Choice NGO and organiser of charity events.

22 ### ЕВРОМОЗАИКА / EUROMOSAIC



**ЕЎРАБЮЛЕТЭНЬ**
Інфармацыйнае выданне Прадстаўніцтва Еўрапейскага Саюза ў Беларусі

вул. Энгельса, 34А/2
220030 Мінск
Рэспубліка Беларусь
Тэлефон: +375 (17) 328 66 13
Факс: +375 (17) 289 12 81
Эл. пошта:
delegation-belarus@eeas.europa.eu
delegation-belarus-press@eeas.europa.eu
(Press & Information)
http://eeas.europa.eu/delegations/belarus

«Еўрабюлетэнь» выдаецца пры падтрымцы Еўрапейскага Саюза. За змест выдання адказвае Particip GmbH. Змест выдання не можа лічыцца адлюстраваннем пазіцыі Еўрапейскага Саюза © European Union, 2012/13 The contents of this material are the sole responsibility of Particip GmbH and cannot be taken to reflect the views of the European Union

**Publisher:**
Particip GmbH, Merzhauser Str., 183, D — 79100 Freiburg
Phone: +49 (0) 761 790 740,
Fax: +49 (0) 761 790 7490,
info@particip.de

**Галоўны рэдактар / Chief Editor:**
Vladimir Smekhov / Уладзімір Смехаў
vladimir.smekhov@free.fr
**Рэдакцыйная група:**
**Шэф-рэдактар:**
Алена Штэрнік
**Аўтары:**
Ілля Прэрыеў,
Марыя Савушкіна,
Арцём Шрайбман,
Станіслаў Каршуноў
Таццяна Каровенкава
**Дызайн і вёрстка:**
Марыя Золатава

**Тыраж:**
299 асобнікаў
Бясплатны распаўсюд
Падпісана ў друк 5.03.2013
**Інтэрнэт-версія:**
http://eeas.europa.eu/delegations/belarus/press_corner/eurobulletin

Каб атрымліваць электронную версію Еўрабюлетэня, дашліце нам запыт са сваімі дадзенымі на delegation-belarus-press@eeas.europa.eu

# «Пагадненне дасягнута»

***Лідары краін-сябраў Еўрапейскага Саюза на саміце ў Брусэлі, якія прайшоў 8 лютага, здолелі знайсці кампраміс на перамовах па бюджэце. Было прынята рашэнне скараціць выдаткі на 3% (прыкладна на 34 мільярды еўра).***






*Журналіст у канферэнц-залі чакае рашэння лідараў Еўрапейскага Саюза па бюджэце на 2014-2020 гг.*

За эканомію і мінімальныя выдаткі выступалі краіны ў авангардзе з Вялікабрытаніяй, Нідэрландамі і Германіяй, астатнія змагаліся за захаванне максімальна магчымага аб'ёму бюджэту.

Яшчэ да саміту многія еўрапейскія лідары далі зразумець, што перамовы па бюджэце будуць няпростымі. Пра гэта сведчыла таксама і тое, што сустрэча ў Брусэлі была другой па ліку. Падчас першага саміту ў лістападзе мінулага года краіны-сябры так і не здолелі прыйсці да агульнага назоўніка.

Старшыня Еўрапейскага Савета Герман ван Рампей пасля завяршэння лютаўскага саміту напісаў у сваім Твітары: «Пагадненне дасягнута, і яно таго варта».

**У першапачатковым праекце бюджэту** выдаткавая частка складала 1,047 трыльёна еўра. Старшыня Еўрапейскага Савета Герман ван Рампей прапанаваў зменшыць гэтую лічбу да 973 млрд. Аднак у выніку перамоваў бюджэт ЕС быў скарочаны да 960 мільярдаў еўра. Унёскі краін таксама скараціліся да 908 мільярдаў.






фота: eeas.europa.eu

# 9 высноваў з Усходняга партнёрства

***Міністры замежных спраў краін ЕС на пасяджэнні Савета 18 лютага абмеркавалі ход праграмы "Усходняе партнёрства". Выніковы дакумент утрымлівае 9 асноўных тэзісаў.***

**Па-першае**, Савет ЕС ўпэўнены ў неабходнасці працягваць Усходняе партнёрства, адно з вымярэнняў Еўрапейскай палітыкі суседства. Захоўваецца прыхільнасць асноўным мэтам гэтай праграмы: палітычнаму збліжэнню і эканамічнай інтэграцыі ўсходне-еўрапейскіх краін з Еўрапейскім Саюзам.

**Па-другое**, краінам-удзельніцам праграмы нагадваюць пра неабходнасць прытрымлівацца выпрацаванай раней Дарожнай карты Усходняга партнёрства. Вынікі ажыццяўлення гэтага плана будуць прадстаўленыя на наступным саміце Усходняга партнёрства ў Вільні ў лістападзе 2013 года.

**Па-трэцяе**, Савет абвяшчае, што ядром супрацоўніцтва ў рамках Усходняга партнёрства з'яўляецца прыхільнасць удзельнікаў міжнарод-на-прававым прынцыпам, каштоўнасцям дэмакратыі, вяршэнству права, павазе да правоў чалавека, рыначнай эканоміцы і ўстойліваму развіццю. Дзяржавам-удзельніцам нагадалі пра прынцып "больш за большае" — чым больш паспяхова краіна-сусед праводзіць рэформы, тым больш выгодаў яна можа атрымаць ад супрацы з ЕС, у тым ліку ў рамках Усходняга партнёрства. Асаблівая ўвага надаецца адпаведнасці міжнародным стандартам надыходзячых выбараў у Арменіі, Азербайджане і Грузіі.

**Па-чацвёртае**, Савет вітае перамовы па заключэнні Пагаднення аб Асацыяцыі паміж ЕС і Украінай, а таксама заклікае заключыць пагадненне аб стварэнні глыбокай і ўсёабдымнай Зоны свабоднага гандлю з Малдовай, Грузіяй і Арменіяй да лістападаўскага саміту ў Вільні.

**Па-пятае**, адзначаецца пэўны прагрэс у рэалізацыі Плана дзеянняў па лібералізацыі візавага рэжыму з Грузіяй, Азербайджанам і Арменіяй.

**Па-шостае**, Савет вітае бурнае развіццё супрацоўніцтва на шматбаковым узроўні паміж краінамі-ўдзельніцамі Усходняга партнёрства дзеля абмену станоўчым досведам, у прыватнасці, па пытаннях выканання Дарожнай карты.

**Па-сёмае,** увага краін-удзельніц праграмы прыцягваецца да неабходнасці шырокага ўцягвання няўрадавых дэмакратычных арганізацый у супрацоўніцтва з Еўрапейскім Саюзам. Савет ЕС вітае стварэнне нацыянальных платформаў на аснове Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства. Савет таксама заклікае развіваць бізнес-форум, павялічваць падтрымку моладзевых і адукацыйных міжнародных праектаў у рамках Усходняга партнёрства.

**Па-восьмае,** Савет дзякуе Еўрапейскаму Саюзу за фінансавую дапамогу дзяржавам-удзельніцам праграмы (1,9 мільярды еўра з 2010 па 2013 гады), а таксама заклікае Еўрапейскі інвестыцыйны банк паспрыяць прыцягненню інвестыцый у краіны рэгіёну.

Нарэшце, **па-дзявятае**, Савет ЕС ускладае сур'ёзныя надзеі на наступны саміт Усходняга партнёрства ў Вільні.



фота: consilium.europa.eu



Камісар ЕС па пытаннях адукацыі, культуры, шматмоўя і моладзі Андрула Васіліў перад запускам новай міжнароднай сістэмы ацэнкі ўніверсітэтаў адзначыла, што існуючыя рэйтынгі бяруць за аснову толькі даследніцкія поспехі. Новая рэйтынгавая сістэма будзе ацэньваць універсітэты па некалькіх паказніках у пяці галінах: даследніцкая рэпутацыя, якасць выкладання і навучання, міжнародная арыентацыя, паспяховасць у перадачы ведаў (напрыклад, супраца з бізнесам) і ўнёсак у рэгіянальнае развіццё. *«Новы падыход дазволіць студэнтам падчас выбару коледжа ці ўніверсітэта аддаць перавагу менавіта той установе адукацыі, якая ім максімальна падыходзіць. Новая сістэма таксама зробіць істотны ўнёсак у павышэнне якасці адукацыі, дазволіць універсітэтам выявіць свае моцныя і слабыя бакі, а таксама ўлічваць і выкарыстоўваць досвед адзін аднаго. Акрамя таго, новы рэйтынг прадэманструе палітыкам больш поўную карціну сістэмы вышэйшай адукацыі ў іх краінах, што дазволіць ім прыняць захады па павелічэнні многіх паказнікаў»,* — адзначыла еўракамісар.

Чакаецца, што ўдзел у рэйтынгу возьмуць каля 500 універсітэтаў. Першыя вынікі будуць апублікаваныя ў пачатку 2014 года.



Віцэ-прэзідэнт Еўракамісіі Вівіан Рэдынг заявіла, што Еўрапейскі Саюз прыкладзе ўсе намаганні, каб абараніць еўра ад фальшываманетчыкаў: *«Мы ўдасканалім змаганне з падробкамі праз узмацненне крымінальнай адказнасці і больш эфектыўнае расследаванне».*

Па самых сціплых падліках, з 2002 года фальшываманетчыкі прычынілі Еўрапейскаму Саюзу шкоду ў 500 мільёнаў еўра. Па дадзеных Еўрапейскага цэнтрабанка, у 2012 годзе былі выключаны са звароту каля 531 тысячы банкнот еўра. Апроч таго, за мінулы год было выяўлена і канфіскавана 184 тысячы падробленых манет, што на 17% больш, чым за 2011-ы. Такія маштабы вымусілі Еўрапейскую Камісію распрацаваць комплекс мер па ўзмацненні абароны банкнот і манет еўра, а таксама нацыянальных валют краін-сябраў ЕС. Так, напрыклад, прапануецца ўзмацніць трансмежную супрацу падчас расследаванняў злачынстваў па падробцы грошай, а таксама ўвесці мінімальную адказнасць у выглядзе арышту тэрмінам на 6 месяцаў за сур'ёзныя парушэнні права ў гэтай галіне. Максімальнае пакаранне прапануецца ўсталяваць на ўзроўні не менш за восем гадоў.

фота: eeas.europa.eu



## 105 мільёнаў еўра

складае агульная сума фінансавання прац па аднаўленні знакамітага помніка — старажытнарымскага горада Пампеі, у межах праекта «Захаванне, падтрымка і ўдасканаленне месца археалагічных раскопаў у Пампеях». Перад пачаткам прац, згоду на фінансаванне якіх Еўрапейская Камісія дала яшчэ ў сакавіку 2012 года, Камісар Еўрапейскага Саюза па рэгіянальнай палітыцы Ёханэс Хан падкрэсліў важнасць праекта: *«Я рады, што мы прыцягнулі сродкі рэгіянальнага фонда ЕС для аднаўлення помніка, які мае велізарнае значэнне для ўсяго свету, для Італіі і для рэгіёна Кампанія. У нас з'явілася магчымасць не толькі захаваць частку еўрапейскай культурнай спадчыны, але і ажывіць эканоміку рэгіёна Кампанія шляхам прыцягнення большай колькасці турыстаў і стварэння новых працоўных месцаў».* Аднаўленчыя працы неабходныя, бо ў кастрычніку 2011 года залева сур'ёзна пашкодзіла рэшткі будынкаў, а моцны шторм у 2010-м прывёў да абвалу Дома гладыятараў, і пад яго руінамі апынуліся ўнікальныя старажытныя фрэскі.



## 335 работ з 37 еўрапейскіх краін

былі намінаваны на прэстыжную ўзнагароду Еўрапейскага Саюза ў галіне сучаснай архітэктуры — прэмію Людвіга Міс ван дэр Роэ. З дасланых на конкурс работ напрыканцы студзеня кампетэнтнае журы абрала пяць фіналістаў, адзін з якіх і стане пераможцам. Імя ўладальніка галоўнага прыза будзе абвешчана ў траўні. Камісар ЕС па пытаннях адукацыі, культуры, шматмоўя і справах моладзі Андрула Васіліў павіншавала фіналістаў і падзякавала ўсім намінантам, якія даслалі свае працы. *«Еўрапейская Камісія і Фонд Міс Ван дэр Роэ ўзялі на сябе абавязак падтрымваць гэты від мастацтва, які робіць вялікі ўнёсак у эканоміку, стварае новыя працоўныя месцы і ў той жа самы час здзіўляе нас сваёй прыгажосцю. Мы працягнем падтрымліваць развіццё архітэктуры, у тым ліку з дапамогай гэтай прэміі, а таксама дзякуючы нашай праграме «Творчая Еўропа»*, — дадала еўракамісар. Прэмія Міс ван дэр Роэ адзначае ўнёсак еўрапейскіх архітэктараў у развіццё новых ідэй у сучасным горадабудаўніцтве. Найлепшыя архітэктары-наватары абіраюцца раз на два гады і атрымліваюць грашовую прэмію памерам 60 тысяч еўра, а таксама статуэтку, якую стварыў вядомы каталонскі скульптар Хаўер Карбера.

фота: facebook.com / European Commission, Particip GmbH




**680 мільёнаў еўра** атрымалі 302 старэйшыя навуковыя супрацоўнікі з 24 еўрапейскіх краін у рамках праграмы «прасунутых грантаў» для рэалізацыі інавацыйных ідэй у розных галінах навукі. Так, напрыклад, калектыў навукоўцаў з Францыі будзе працаваць над развіццём новых мадэляў для тлумачэння фізічнага феномену звышправоднасці. Іх калегі з Латвіі з дапамогай інфарматыкі, фізікі і матэматыкі ацэняць перавагі квантавых прыбораў. Агулам у Еўрапейскую даследніцкую раду для ўдзелу ў праграме было пададзена 2300 заявак. З іх толькі 13% атрымалі патрэбнае фінансаванне. Паводле ўмоў максімальны бюджэт праектаў не павінен быў перавышаць 2,5 мільёнаў еўра, а ў якасці заяўнікаў маглі выступаць толькі вядучыя спецыялісты. *«Падтрымка даследаванняў вядзе да істотнага павелічэння колькасці адкрыццяў і публікацый у навуковых часопісах і неабходна для павышэння канкурэнтаздольнасці Еўропы. Таму мы прапанавалі павялічыць бюджэт Еўрапейскай даследніцкай рады ў рамках праграмы ЕС «Гарызонт-2020»*, — паведаміла еўракамісар па даследаваннях і інавацыях Майрэ Гогхэган-Куін.






фота: eeas.europa.eu, right2water.eu

**1 197 618 подпісаў** сабралі арганізатары ініцыятывы «Права на ваду», каб пераканаць краіны Еўрапейскага Саюза гарантаваць усім грамадзянам права на ваду і прымальныя санітарныя ўмовы. Натхняльнікі ініцыятывы мяркуюць, што «вада — гэта не тавар», і настойваюць на тым, што прадстаўнікі ўсіх слаёў грамадства павінны мець да яе доступ. Ініцыятыва прапануе Еўрапейскай Камісіі распрацаваць заканадаўчыя палажэнні, якія б замацавалі правы чалавека на ваду і добрыя санітарныя ўмовы, як ужо зрабіла ААН. Віцэ-прэзідэнт Еўрапейскай Камісіі Марош Шэфчовіч павіншаваў арганізатараў ініцыятывы, адзначыўшы, што нават нягледзячы на неабходнасць праверкі сапраўднасці подпісаў, заручыцца такой падтрымкай менш чым за 6 месяцаў — гэта вялікае дасягненне: *«Мэта Еўрапейскай грамадзянскай ініцыятывы — прыцягнуць увагу грамадскасці да ўсеагульнай дыскусіі па пытаннях, што датычацца ўсіх грамадзянаў Еўрапейскага Саюза. Актывісты кампаніі «Права на ваду», безумоўна, гэтага дамагліся»*. Арганізатары ўжо могуць падаць афіцыйны зварот у Еўрапейскую Камісію і ў трохмесячны тэрмін атрымаць адказ, але яны вырашылі працягнуць збор подпісаў.

# Европейский Союз едет к вам*

**Синий автобус с желтыми звездами перемещается от города к городу и от села к селу Грузии и называется строго и торжественно – Мобильный информационный центр. Его придумала команда Представительства ЕС в Грузии, чтобы делиться с жителями отдаленных от столицы регионов страны сведениями о том, что такое Европейский Союз и что он делает в Грузии. Представитель Инфоцентра европейского партнерства Майи Читаиа побывала в этом автобусе.**

* серия репортажей о проектах, финансируемых региональными программами Европейского Союза. Репортажи подготовлены Инфоцентром европейского соседства.




фото: enpi-info.eu, Particip GmbH

…Наш автобус отправляется рано утром. В салоне — группа волонтеров из Представительства ЕС, Международной миграционной организации, Грузинской ассоциации молодых юристов (GYLA), а также Мультиэтнического ресурсного центра. Группа обеспечена визуальными и аудиоматериалами, брошюрами, книгами и, конечно, сувенирами. В целом в Грузии проявляют некоторое недоверие к международным институтам, но всех, кто собрался в автобусе, вдохновляет надежда на то, что наша поездка сможет изменить ситуацию.

### Разные люди

Мы приезжаем в Гори; это — один из самых уязвимых регионов, где лагерь для беженцев постоянно напоминает людям о кошмаре военного конфликта. Автобус с логотипом ЕС на центральной площади, конечно, привлекает внимание, но люди предпочитают наблюдать за нами издалека.

Одной из первых молчание прерывает Наргиз, 85-летняя представительница узбекского меньшинства, которая живет в Грузии с 1995 года одна на очень небольшие деньги, которые ей посылает дочь из Украины. *«Этих денег мне едва хватает на лекарства,* — говорит она. — *Я бы хотела получать пенсию в Грузии, но я не гражданка этой страны…»* Волонтеры из GYLA рассказывают Наргиз о возможности иметь двойное гражданство, при котором она могла бы претендовать на получение пенсии в Грузии. Лед тронулся — в автобус начинают заходить самые разные люди: государственные служащие, которые хотят знать об оплате сверхурочных, родственники пострадавших в военных действиях, которым нужна психологическая поддержка, молодые люди, которые ищут легальных путей эмиграции в европейские страны…

Мы двигаемся дальше — в поселок для перемещенных лиц в Церované. Благодаря финансовой поддержке ЕС, после войны 2008 года были построены сотни небольших домов, в которых теперь живут люди, бежавшие из Южной Осетии. *«Смотри, пап, американцы приехали!»* — кричит отцу шестилетний Давид. Мы объясняем, что мы, как и он сам — грузины, но работаем в представительстве Европейского Союза, который объединяет 27 европейских стран, и приглашаем Да-

вида с друзьями посмотреть документальный фильм о Европе. Добираемся до Кутаиси, одного из древних городов Грузии. Тема блиц-викторины, которую предлагает наша группа — «Что вы знаете о Европейском Союзе». Вопросы различаются по уровню сложности: от времени основания ЕС и количества стран-членов до «Назовите три страны–члена Европейского Союза».









### Унести Европу домой

Первая школа, которую мы посетили, находится в поселке для перемещенных лиц. Мы готовимся к презентации: развешиваем иллюстрации, показывающие, как ЕС изменил жизнь людей, устанавливаем экран и проектор для показа 20-минутного документального фильма об истории Союза, который помогает понять особенности экономической и культурной жизни стран-членов ЕС, а также выделяет основные исторические вехи. В детях просыпается интерес, когда они узнают, что здесь можно выиграть приз. Подростки от 12 до 15 лет внимательно слушают, даже ведут записи. Когда настает пора вопросов, они дают правильные ответы. *«Помимо прочего, это — хороший опыт для учителей,* — говорит Майя Грдзелидзе, учительница истории. — *Я поражена тем, насколько ребята увлечены происходящим — даже те, кому обычно трудно сконцентрироваться, реагируют и дают правильные ответы!»*

Георгию Накаидзе девять лет, он живет со своей семьей в Рустави. Мы встретили его на главной площади — Георгий возвращался с футбольной тренировки. *«Можешь назвать одну страну-члена ЕС и ее столицу?»* — *«Конечно! Это — родина моей любимой футбольной команды, Реал Мадрид. Испания»*. Глаза его блестят от радости. Он хочет попробовать ответить на другой вопрос и получить возможность выиграть детскую книжку «Путешествие по Европе». *«Принесу Европейский Союз домой и прочитаю братьям и сестрам,* — говорит Георгий. — *Столица Франции? Это я знаю. Париж…»* Георгий мечтает съездить в Диснейленд. И вот он уходит с сувенирами и намерением унести домой Европу.

ЕС финансирует свои проекты в Грузии посредством грантов, договоров и, все чаще, бюджетной поддержки.




## "ЕЎРОПА Ў ЧАМАДАНЕ"

У рамках Усходняга партнёрства запушчаны праект для маладых спецыялістаў (ад 20 да 30 гадоў) "Еўропа ў чамадане". Удзельнікі ў невялікіх групах разам з калегамі з Германіі і краін Усходняй Еўропы правядуць ва Украіне, Малдове і іншых краінах сустрэчы і дыскусіі на еўрапейскую тэматыку.

З ініцыятывай праекта выступілі польскі Фонд ім. Шумана, Еўрапейская акадэмія Берліна, Фонд імя Боша, Фонд імя Адэнаўэра, Фонд імя Зайдзеля і Фонд імя Фрыдрыха Наўмана. Падчас трох паездак працягласцю да пяці дзён каманды будуць падарожнічаць па краінах Усходняга партнёрства, каб актывізаваць дыялог маладых людзей па пытаннях, звязаных з Еўропай.

Каманды наведаюць чатыры ўніверсітэты, моладзевыя клубы і офісы грамадскіх арганізацый. Усе выдаткі (праезд, страхоўка, пражыванне, харчаванне) аплачваюцца арганізатарамі.

Больш падрабязную інфармацыю пра праект можна знайсці па наступных спасылках: **http://europeinasuitcase.eu** и **http://www.schuman.pl/europa-w-walizce-359.**

# Разам супраць катастроф

**Павысіць узровень абароненасці жыхароў краін-партнёраў на выпадак тэхнагенных і стыхійных катастроф заклікана праграма PPRD East. Праграма фінансуецца Еўрапейскім Саюзам і накіравана пераважна на папярэджанне людзей пра надзвычайныя сітуацыі, што могуць скласціся ў кожным з рэгіёнаў: напрыклад, сейсмічныя пагрозы, навадненні, сухмені, лясныя пажары ды аварыі на прамысловых аб'ектах.**












фота: euroeastcp.eu, flickr.com / EU humanitarian Aid and Civil Protection

Праграма мае чатыры накірункі:

**1. Удасканаленне інфармацыйнай базы пра сітуацыі, што могуць складвацца ў кожным канкрэтным рэгіёне.**

Вядома, у кожным рэгіёне свае рызыкі. Напрыклад, па меркаванні экспертаў, Беларусі варта быць падрыхтаванай да сухменяў, лясных пажараў, землятрусаў, штармавых вятроў і нават апоўзняў. Асобна эксперты згадваюць пра Чарнобыльскую катастрофу і яе наступствы.

**2. Умацаванне патэнцыялу па прадухіленні надзвычайных сітуацый і забеспячэнне гатоўнасці да іх.**

Тут важнае месца займаюць вучэнні. Працоўны план PPRD East прадугледжвае арганізацыю чатырох





камандна-штабных і аднаго палявога вучэння з прыцягненнем рэсурсаў усіх шасці краін-партнёраў. Падчас вучэнняў адпрацоўваюцца найбольш тыповыя для рэгіёна надзвычайныя сітуацыі: землятрусы, паводкі, лясныя пажары ці хімічныя аварыі.

### 3. Інфармацыйна-асветніцкая праца.

Рэгулярна арганізуюцца семінары, сустрэчы і дыскусіі, падчас якіх эксперты краін-сябраў Еўрапейскага Саюза дзеляюцца сваімі ведамі і досведам.

У снежні мінулага года прадстаўнікі краін-партнёраў Праграмы PPRD East узялі ўдзел у навучальным падарожжы ў Мадрыд. Спецыялісты ратавальных службаў і журналісты азнаёміліся з іспанскай практыкай прадухілення надзвычайных сітуацый і арганізацыі сістэмы бяспекі на розных узроўнях: нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым. Апроч таго ўдзельнікі наведалі



студэнтаў туды на бясплатнае навучанне.

### 4. Праграма абмену экспертамі.

Любая праца ў рамках праграмы PPRD East спрыяе збліжэнню механізмаў пераадолення надзвычайных сітуацый краін-удзельніц і адпаведнага механізму Еўрапейскай супольнасці.

***Цэнтр маніторынгу і інфармацыі** — цэнтральная арганізацыя Механізма рэагавання на надзвычайныя сітуацыі, дзейнасць якога забяспечваюць 32 краіны (27 краін-сябраў ЕС, а таксама Харватыя, Македонія, Ісландыя, Ліхтэнштэйн і Нарвегія). Цэнтр функцыянуе кругласуткава пад кіраваннем Генеральнага дырэктарата Еўрапейскай Камісіі па гуманітарнай дапамозе і надзвычайных сітуацыях.*

*Больш пра Механізм рэагавання на надзвычайныя сітуацыі:* **http://ec.europa.eu/echo/policies/disaster_response/mechanism_en.htm**

*Больш пра Цэнтр маніторынгу і інфармацыі:* **http://ec.europa.eu/echo/policies**






Цэнтр надзвычайных сітуацый 112, дзе аб’яднаныя ўсе службы, патрэбныя для папярэджання людзей і ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый.

Таксама было цікава азнаёміцца з тым, якая праца вядзецца з навучэнцамі навучальных устаноў Мадрыда. Улічваючы, што ў навучальных планах няма абавязковага курса па асновах бяспекі жыццядзейнасці, многія школы і ўніверсітэты дамаўляюцца з нацыянальнай школай ратавальнікаў і накіроўваюць школьнікаў і

## 112 – АДЗІНЫ НУМАР ВЫКЛІКУ ЭКСТРАНЫХ СЛУЖБАЎ

Еўрапейская Камісія і Еўрапейская асацыяцыя турыстычных агенцтваў і тураператараў звярнуліся з просьбай да тураператараў і агенцтваў інфармаваць сваіх кліентаў аб агульнаеўрапейскім нумары выкліку экстраных службаў — 112 — праз размяшчэнне інфармацыі пра гэты нумар на сваіх сайтах і электронных квітках.

Па бясплатным нумары 112 можна патэлефанаваць са стацыянарных і мабільных тэлефонаў паўсюдна ў Еўрапейскім Саюзе. Служба працуе кругласуткава і дае магчымасць выклікаць неабходную дапамогу — паліцэйскую, пажарную або медыцынскую.

# Эфектыўна працаваць, эканомна жыць




***Наладзіць эфектыўную і ашчадную вытворчасць беларускім прадпрыемствам дапаможа Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця, які распачаў праграму фінансавання энергаэфектыўных праектаў праз мясцовыя прыватныя банкі.***








> ***«Энергія пакуль у нас танная,*** *таму многія пра яе захаванне проста не задумваюцца».*
>
> Сяргей Хільчук, намеснік дырэктара па эканоміцы і фінансах ААТ «Брэсцкі мясакамбінат»

У Беларусі спажыванне энергіі на адзінку валавага ўнутранага прадукта (ВУП) у 2,5 разы вышэй, чым у краінах Еўрапейскага Саюза. З-за высокіх выдаткаў на энерганосьбіты кошт тавараў і паслуг павялічваецца, а заробкі і прыбыткі памяншаюцца. Каб дапамагчы вырашыць гэтую праблему і навучыцца больш ашчадна выкарыстоўваць энергарэсурсы, Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця адкрывае крэдытную лінію аб'ёмам 50 мільёнаў долараў для ажыццяўлення праектаў у Беларусі. Падпісанне пагаднення пра прадастаўленне першай крэдытнай лініі адбылося ў Мінску 13 лютага. Пагадненне з'яўляецца часткай Праграмы фінансавання ўстойлівай энергетыкі ў Беларусі (BelSEFF), якую праводзіць Банк. На цырымоніі падпісання прысутнічалі прадстаўнікі Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, кіраўнікі банкаў, міжнародных кампаній, дэлегацыя з Чэхіі і кіраўнікі беларускіх прадпрыемстваў.

«Устойліва» — слова, якое часта гучала на прэзентацыі. Сучаснае жыццё зрабіла гэты панятак сінонімам слоў «эфектыўна» і «ашчадна». Навучыцца эканоміць, у тым ліку і энергію — ключавая практыка для кіраўнікоў прадпрыемстваў — як дзяржаўных, так і прыватных.

*«Беларусь імпартуе больш за 80% энерганосьбітаў, і гэта значна ўплывае на дэфіцыт бягучага рахунку. Рэзкае скарачэнне субсідый у галіне энэргаэфектыўнасці стварае ўмовы, у якіх роля інвестараў, камерцыйных банкаў і міжнародных фінансавых інстытутаў, такіх як ЕБРР, становіцца яшчэ больш істотнай»,* — адзначаюць арганізатары праграмы BelSEFF.

Праграма па крэдытаванні энергаэфектыўных праектаў ЕБРР у Беларусі разлічаная на пяць гадоў. Сродкі, што атрымаюць беларускія прадпрыемствы, будуць выдаткаваныя на праекты па энергазахаванні і асваенні аднаўляльных крыніц энергіі. Праекты могуць ажыццяўляцца як у вытворчым сектары, так і сферы камерцыйнай нерухомасці. Магчымае крэдытаванне мадэрнізацыі сістэм ацяплення і вентыляцыі ды замены альбо мадэрнізацыі энергаёмістага абсталявання. Для камерцыйнай нерухомасці банкі-партнёры ЕБРР адкрыюць крэдытную лінію па фінансаванні праектаў па замене старых, нізкаэфектыўных ацяпляльных сістэм, вокнаў, цеплавой ізаляцыі будынкаў, па ўвядзенні сістэм кантролю энергаспажывання і іншага. Таксама пад

фота: KPMG

> **Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця** распачаў Ініцыятыву ў галіне ўстойлівай эканомікі ў 2006 годзе. Усяго ў межах Ініцыятывы ўжо інвеставана 11 мільярдаў еўра і рэалізавана больш за 600 праектаў ва ўсіх краінах. У выніку інвестыцый штогадовыя выкіды двухвокісу вугляроду скараціліся больш чым на 55 мільёнаў тон.

увагу бакоў, якія заключылі пагадненне ў Мінску, падпадае пытанне выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі. Банкі прапануюць беларускім прадпрыемствам крэдыты на асваенне ветравых і сонечных энергарэсурсаў, запуск малых гідраэлектрастанцый, выкарыстанне біямасы для генерацыя цяпла і г.д. Таксама сродкі змогуць атрымаць пастаўшчыкі энергаэфектыўных тавараў, як, напрыклад, новых мадэляў вокнаў ці будаўнічых матэрыялаў.

Агульныя задачы Праграмы — знізіць выдаткі на энергію на 20% на адзінку прадукцыі, а таксама забяспечыць акупнасць інвестыцый цягам 15 гадоў. *«Скарачэнне энергаспажывання, змяншэнне выдаткаў, павялічэнне прыбыткаў і канкурэнтназдольнасці для беларускіх прадпрыемстваў — вось нашыя асноўныя мэты»,* — зазначыў падчас прэзентацыі Міраслаў Малы, аперацыйны лідар ЕБРР па тэхнічнай падтрымцы Праграмы фінансавання ўстойлівай энергетыкі BelSEFF.

Мерапрыемства ў Мінску наведала прадстаўнічая дэлегацыя з Чэхіі. Чэшская Рэспубліка прадаставіла грант у памеры 1,5 мільёнаў еўра — сродкі будуць накіраваныя на павышэнне ведаў у пытаннях энергетычнай эфектыўнасці, а таксама для спрыяння дыялогу паміж прадстаўнікамі ўлады і няўрадавымі арганізацыямі, накіраванага на развіццё праўнай і інстытуцыянальнай базы для падобных праектаў.

Нягледзячы на тое, што прыярытэт працы Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця ва ўсіх краінах — садзейнічанне развіццю прыватнага сектара, для Беларусі будзе зроблена выключэнне. Частка фінансавання ў межах праграмы BelSEFF будзе дасяжная для некаторых дзяржаўных кампаній, паколькі інвестыцыі ў галіне энергаэфектыўнасці найбольш востра патрабуе дзяржаўны сектар Беларусі.

*«Энергазахаванне — гэта для нас не проста моднае слова. Мы лічым грошы, нашыя праекты павінны апраўдваць сябе»,* — кажа Сяргей Хільчук, намеснік дырэктара па эканоміцы і фінансах ААТ «Брэсцкі мясакамбінат» — прадпрыемства, большая частка якога знаходзіцца ва ўласнасці дзяржавы.

## ХТО АТРЫМАЕ КРЭДЫТНЫЯ СРОДКІ ПА ПРАГРАМЕ BELSEFF?

13 лютага, у дзень афіцыйнага старту Праграмы, прадстаўнікі «Белгазпрамбанка" і ЕБРР падпісалі пагадненне па прадастаўленні першаму крэдытнай лініі аб'ёмам 13 мільёнаў долараў. Сродкі пойдуць на займы кліентам «Белгазпрамбанка" для ажыццяўлення праектаў па забеспячэнні энергаэфектыўнасці. «МТБанк», які крэдытуе прыватны сектар, таксама атрымаў магчымасць адкрыць крэдытную лінію аб'ёмам 4 мільёны долараў. Працягваюцца перамовы пра магчымы ўдзел у Праграме іншых банкаў.

*«Канкурэнтнай перавагай гэтай крэдытнай праграмы мы лічам магчымасць тэхнічнага кансультавання кліентаў,* — адзначыў Валеры Смаляк, прадстаўнік «МТБанка». — *Кансультацыі нашых партнёраў дапамогуць кліентам банка не толькі задумацца пра энергазахаванне, але і атрымаць канчатковыя дадзеныя энергаэфектыўнасці праекта».* Таксама сп. Смаляк паведаміў, што яго банк ужо зараз гатовы прадаставіць крэдыты з атрыманых па праграме BelSEFF сродкаў сваім кліентам па рынкавых стаўках.

Больш інфармацыі пра Праграму фінансавання ўстойлівай энергетыкі ў Беларусі на **www.belseff.by** і **www.ebrd.by**.




## МЕЖДУНАРОДНЫЕ ЭКСПЕРТЫ СРАВНИЛИ БИЗНЕС-КЛИМАТ В БЕЛАРУСИ И СТРАНАХ ВОСТОЧНОГО ПАРТНЕРСТВА

